# ЧАС РАШАЦЬ ПРАБЛЕМУ

## На наступным тыдні Прэзідэнт мае намер падпісаць дакумент аб удасканаленні пенсійнай сістэмы

**Вырашэнне пытання ўдасканалення пенсійнай сістэмы нельга зводзіць толькі да пенсійнага ўзросту. Пра гэта заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на нарадзе, прысвечанай абмеркаванню гэтай тэмы.**

«Гэта важнае пытанне, яно сёння на слыху, але гэта не ўся пенсійная сістэма. Акрамя пенсійнага ўзросту, як мінімум ёсць яшчэ праблема ўдасканалення самой пенсійнай сістэмы, гэта значыць фарміравання пенсійнага фонду і, скажам прама, у выніку — памеру пенсій», — сказаў кіраўнік дзяржавы, падкрэсліўшы, што рашэнне гэтага пытання ўжо наспела. «Па меры назапашвання праблем, з'яўлення новых, пытанняў, якія трэба вырашаць, якія паўстаюць востра, — іх трэба вырашаць, у спакойным рэжыме, размаўляючы з людзьмі, пераконваючы наша грамадства ў тым, што гэта трэба рабіць», — дадаў кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што так паступілі з вырашэннем пытання па камунальных паслугах, знайшоўшы кампрамісны варыянт з грамадствам. «Што тычыцца пенсійнай сістэмы, якой ёй быць: салідарнай, размеркавальнай ці назапашвальнай. Людзі прынялі таксама нашу прапанову, што сыходзіць ад гэтага не трэба, павінна быць салідарная, размеркавальная сістэма пенсій, як у нас зараз, і на добраахвотнай аснове назапашвальная сістэма, што ў нас не забаронена і заканадаўча вызначана», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

«Што тычыцца пазіцыі нашага грамадства, я вельмі ўважліваназіраю за абмеркаваннямі, развагамі людзей. Мы вельмі акуратна вымяраем настрой грамадства. Павінен сказаць, што сёння ўжо цвёрдая большасць нашага насельніцтва згодныя з павышэннем пенсійнага ўзросту. Я не кажу пра тое, падабаецца камусьці ці не падабаецца. Нават тыя, каму гэта не падабаецца, нарэшце, зразумелі, што рана ці позна мы гэтую праблему павінны вырашаць. І час вырашэння праблемы прыйшоў», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт падзякаваў цяперашнім пенсіянерам, якія раней былі супраць падобных крокаў, а цяпер пагадзіліся. «Калі людзям патлумачылі, у чым сутнасць і як мы маем намер дзейнічаць, у прынцыпе і пенсіянеры — тыя, каго, зрэшты, не датычыць гэтае пытанне, — прынялі нашу пазіцыю. Таму сёння сітуацыя ў грамадстве больш-менш нармальная, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Моладзь наша — ну проста малайцы! Разумеючы, што гэта закране іх перш за ўсё і тых, хто працуе, тым не менш, спакойна ўспрынялі гэтыя прапановы».

«Людзі разумеюць, што сёння колькасць пенсіянераў пры такім пенсійным узросце, у нас, расце значна большымі тэмпамі, чым застаецца працуючых людзей. Гэта значыць людзі, якія працуюць, ужо сёння адчуваюць праблемы з утрыманнем пенсіянераў. У той жа час мы абсалютна разумеем, што ў сілу гэтага, у сілу сітуацыі, якая складваецца, пенсійны фонд у нас не расце, і нам ужо сёння з бюджэту прыходзіцца фінансаваць пенсійны фонд. Гэта нікуды не варта. Мы такім чынам забіраем ва ўрачоў, настаўнікаў, ваенных і гэтак далей пэўныя сродкі, не развіваем дзяржаўныя і іншыя праграмы, аддаючы грошы на тое, каб падтрымаць пенсіянераў. Гэта дрэнна. У той жа час разумеем, што паменшыць пенсіі нельга. Гэтак жа, як і нельга павялічыць падаткі або сацыяльныя ўзносы, плацяжы ў сацыяльныя фонды. Гэта таксама не шлях. Таму ад прыняцця адпаведных рашэнняў нам нікуды не дзецца», — лічыць кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся ва ўдзельнікаў нарады, як складваецца сітуацыя па стварэнні новых працоўных месцаў. «Таму што калі мы ўводзім навацыі ў пенсійную сістэму са студзеня наступнага года, так ці інакш паўстане пытанне па працоўных месцах, — адзначыў Прэзідэнт. — Трошкі павялічыцца колькасць працуючых людзей, яны павінны быць занятыя, і мы да гэтага павінны быць гатовыя». Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што адпаведнае рашэнне па стварэнні новых працоўных месцаў прынята. «Майце на ўвазе, што гэта жалезнае рашэнне Прэзідэнта! 50 і больш тысяч працоўных месцаў павінны быць створаны,» — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт ужо на наступным тыдні мае намер падпісаць дакументы, якія тычацца ўдасканалення ў краіне пенсійнай сістэмы, паведамляе прэс-служба беларускага лідара. «Сёння мы павінны выйсці на вырашэнне гэтай праблемы, каб, як і па ЖКП, так і па гэтым пытанні, паставіць кропку, і на будучым тыдні Прэзідэнт падпісаў адпаведныя дакументы, прыняўшы рашэнне па гэтых пытаннях», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

# На ўзаемавыгадных умовах

## Беларусь і Славенія дамовіліся больш актыўна развіваць усебаковае эканамічнае супрацоўніцтва

**Узаемная зацікаўленасць у пашырэнні кантактаў была выказана ў час сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з намеснікам прэм'ер-міністра — міністрам замежных спраў Славеніі Карлам Эр'яўцам.**

Аляксандр Лукашэнка выказаў падзяку за тую пазіцыю, якую ў апошнія гады займала Славенія ў дачыненні да Беларусі, у прыватнасці, пры абмеркаванні праблем з ЕС. «Не думаю, што ў нас былі ці будуць нейкія праблемы на палітычным, дыпламатычным узроўні ці ў адносінах паміж людзьмі», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што ў Беларусі з рэспублікамі былой Югаславіі, у тым ліку Славеніяй, заўсёды былі добрыя адносіны, якія захаваліся і цяпер.

Пры гэтым Прэзідэнт адзначыў, што падмуркам двухбаковых адносін з'яўляецца эканоміка. На яго думку, каб надаць стабільнасць эканамічным адносінам, нашым краінам трэба мець некалькі (3-4) буйных сумесных праектаў, і яны ўжо вымалёўваюцца.

У сваю чаргу, Карл Эр'явец сказаў пра тое, што Беларусь у асобе Славеніі заўсёды мае надзейнага прыхільніка. На сустрэчы абмяркоўваліся перспектывы развіцця гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, рэалізацыі ўзаемавыгадных праектаў, у тым ліку ў сферах энергетыкі, лесаперапрацоўкі, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. Славенскі бок мае намер развіваць доўгатэрміновыя перспектыўныя праекты з Беларуссю. Кіраўнік дзяржавы запрасіў славенскіх бізнесменаў больш актыўна прыходзіць на беларускі рынак.

Акрамя таго, кіраўнік славенскага МЗС заявіў пра зацікаўленасць у больш хуткім падпісанні дакумента аб спрашчэнні візавага рэжыму паміж Беларуссю і ЕС.

Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што Беларусь гатовая да далейшага ўсебаковага супрацоўніцтва са Славеніяй на ўзаемавыгадных умовах.

■ Кампетэнтна

# Не дапусціць росту нагрузкі на тых, хто працуе



**На старонках «Звязды» аб маючых адбыцца зменах у пенсійнай сістэме выказвалі думкі і эксперты ў галіне сацыяльнага забеспячэння, і простыя грамадзяне. Сёння мы друкуем вытрымкі з інтэрв'ю, якое намеснік прэм'ер-міністра Наталля КАЧАНАВА дала газеце «СБ. Беларусь сегодня».**

***

«Павышэнне планкі пенсійнага ўзросту, перш за ўсё, дасць магчымасць не дапусціць далейшага росту нагрузкі на насельніцтва, якое працуе, збалансаваць даходную і расходную часткі Фонду сацыяльнай абароны. І, акрамя таго, застанецца большая колькасць людзей, якія будуць задзейнічаны ў эканоміцы. Гэта, несумненна, дасць станоўчы эфект — павелічэнне ВУП, рост эканомікі».

***

«На рынку працы, з аднаго боку, будуць заставацца тыя, хто дасягнуў пенсійнага ўзросту, з другога — прыходзіць моладзь, якая заканчвае ВНУ, ССНУ, ПТВ. Кіраўніком дзяржавы падпісаны Указ №78, у якім выразна пастаўлена задача па стварэнні штогод не менш як 50 тысяч новых працоўных месцаў».

***

«Пенсійныя сістэмы ў краінах ЕАЭС, як і эканомікі, розныя. А ў цэлым, усталёўваючы правілы прадастаўлення сацыяльных выплат, кожная краіна можа арыентавацца толькі на свае рэсурсы. Таму механічнае капіраванне заканадаўства іншай краіны без уліку ўласных магчымасцяў проста нерэальнае. З іншага боку, нельга казаць пра тое, што мы рухаемся не ў рэчышчы агульнай палітыкі. Расія сёння таксама актыўна абмяркоўвае перспектывы павышэння пенсійнага ўзросту і не выключана, што падобную рэформу будзе праводзіць паралельна з намі. Казахстан на падобнага роду перамены даўно пайшоў, у іх планка пенсійнага ўзросту паднятая да 58 гадоў у жанчын і да 63 — у мужчын, і сёння яны ўжо гатовыя пайсці на другі этап павышэння.

***

«Мы не выключаем развіццё назапашвальнага кампанента пенсійнай сістэмы, але пакуль выключна ў добраахвотным фармаце. Цікава тое, што ў шматлікіх развітых краінах — Аўстрыі, Бельгіі, Канадзе, Чэхіі, Вялікабрытаніі, ЗША, Францыі, Германіі, Італіі, Іспаніі і іншых — дзяржаўныя пенсійныя сістэмы не ўключалі і не ўключаюць абавязковага назапашвальнага ўзроўню... Таму фарміраванне пенсійных накапленняў, з майго пункту гледжання, і ў нас павінна ісці праз удзел у схемах добраахвотнага дадатковага страхавання на прадпрыемствах. Фарміруючы пенсійную сістэму, важна не дапусціць памылак. Для нас у гэтым пытанні важны аналіз вопыту іншых дзяржаў»

■

■ Парламенцкі дзённік

# У ЧЭХІІ ВЫСОКА ЦЭНЯЦЬ МІРАТВОРЧЫЯ ІМКНЕННІ НАШАЙ КРАІНЫ

**У рамках рабочага візіту нашай парламенцкай дэлегацыі ў Чэхію віцэ-спікер Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Віктар ГУМІНСКІ сустрэўся з намеснікам міністра замежных спраў гэтай краіны Іва ШРАМЕКАМ. Як паведамляе прэс-служба ніжняй палаты парламента, чэшскі дыпламат высока ацаніў дзейнасць нашай дзяржавы ў пытаннях падтрымкі міру і бяспекі ў рэгіёне Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе.**

Іва Шрамек у размове з Віктарам Гумінскім адзначыў магчымасць падтрымкі нашай краіны ў рамках ініцыятывы Усходняга партнёрства. У сваю чаргу, намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў падкрэсліў, што «Рэспубліка Беларусь гатова да паглыблення дыялогу і практычнага супрацоўніцтва ў рамках Усходняга партнёрства пры ўмове яго перафарматавання».

Віктар Гумінскі таксама абмеркаваў пытанні развіцця супрацоўніцтва паміж парламентамі нашай дзяржавы і Чэхіі з намеснікам старшыні Палаты дэпутатаў парламента Чэхіі Войцехам Філіпам. «Чэшскі дэпутат станоўча адзначыў дасягнуты ўзровень узаемадзеяння паміж групамі сяброўства парламентаў абедзвюх краін», — паведамляе прэс-служба.

У горадзе Усці-над-Лабем парламенцкая дэлегацыя сустрэлася з кіраўніком Эканамічнай палаты Усцецкага краю Чэхіі Ф. Ёхманем, які пацвердзіў, што Чэхія гатова развіваць з намі інвестыцыйнае супрацоўніцтва на ўзаемавыгаднай аснове.

Чэшскія кампаніі былі азнаёмлены з інвестыцыйнымі праектамі і запрошаны да стварэння прадпрыемстваў у Кітайска-Беларускім індустрыяльным парку "Вялікі камень».

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*



■

■ Грамадская ініцыятыва

# ЗРАЗУМЕЦЬ, ЯК РАЗВІВАЕЦЦА СВЕТ

**Супрацоўніцтва рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь» і Нацыянальнай акадэміі навук даўно стала традыцыйным. На гэта звярнуў увагу старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Уладзімір ГУСАКОЎ падчас адкрыцця навукова-практычнага семінара «Беларусь у кантэксце глабальных грамадска-палітычных тэндэнцый», арганізаванага «Белай Руссю» і навукоўцамі.**

— Удзельнікі такіх сустрэч спасцігаюць праблемы сацыяльнага развіцця, выпрацоўваюць дзейсныя прапановы і рэалізуюць свайго роду заказ на распрацоўку актуальных падыходаў, методык і тэхналогій, — заявіў ён. — Дзякуючы гэтаму, дасягаецца больш высокая якасць навукова-даследчай працы, узмацняецца яе прыкладное значэнне. Сярод навукоўцаў і спецыялістаў нямала тых, хто бачыць і аналізуе праблемы сучаснага беларускага грамадства сістэмна, хто асэнсоўвае іх у агульнасусветным кантэксце з улікам глабальных выклікаў і пагроз.

— Трэба зразумець, як развіваецца свет, — упэўнены **Аляксандр РАДЗЬКОЎ, старшыня РГА «Белая Русь»**. — Якой можа быць унутраная і знешняя небяспека, найбольш пагроза? Як нам будаваць грамадства? Як развіваць яго структуру? Як улічыць усе небяспекі і не нарабіць памылак? Гэтыя пытанні трывожаць і гуманітарнае аддзяленне Акадэміі навук, і ВНУ, і лідараў грамадскіх аб'яднанняў, і кіраўніка дзяржавы.

— Толькі праз навукова-тэарэтычнае асэнсаванне, паглыбленне ў філасофскія праблемы развіцця грамадства мы можам паспяхова рухацца наперад, — лічыць **Аляксандр КАВАЛЕНЯ, акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай акадэміі навук.**

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■

■ Акцыя

# ПАСАДЗІ ДРЭВА!

## У рэспубліканскай добраахвотнай акцыі «Тыдзень лесу — 2016» прыме ўдзел каля 80 тысяч чалавек

Маштабнае мерапрыемства, прысвечанае 30-годдзю з дня аварыі на Чарнобыльскай АЭС, пройдзе з 2 па 9 красавіка ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.

Па словах **першага намесніка міністра лясной гаспадаркі Аляксандра КУЛІКА**, за ўсю гісторыю правядзення такіх акцый сёлетняя стане самай масавай. Лясгасы краіны рыхтуюць для ўдзельнікаў акцыі каля 800 аб'ектаў, на якіх валанцёры змогуць пасадзіць лес, прывесці да ладу месцы адпачынку, стварыць памятную алею альбо сквер. У асноўным будуць высаджвацца хвойныя пароды — сасна і елка (70%) — і ліставыя — дуб, бяроза, вольха (30%).

Азнаёміцца з поўным спісам аб'ектаў можна будзе ўжо на наступным тыдні на сайце Мінлясгаса *(www. mlhn.gov.by)*. Для таго, каб прыняць удзел у акцыі, трэба звярнуцца ў бліжэйшы лясгас альбо лясніцтва.

**Кацярына РАДЗЮК.** *radziuk@zviazda.by*

■